(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка"

УДК 947.6 "1944/1946"+943.8 "1944/1946"

Вялікі Анатоль Фёдаравіч

# Ажыццяўленне абмена насельніцтвам паміж БССР і Польшчай. 1944-1946 гг.

07.00.02 - айчынная гісторыя

**Аўтарэферат**
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск - 2002

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка

Навуковы кіраўнік: доктар гістарычных навук, прафесар Ладысеў У.Ф. (БДУ, кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу)

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Сакалоў Н.К. (БДПУ, кафедра гісторыі Беларусі)

кандыдат гістарычных навук, дацент Ціхаміраў А.В. (ІГ НАНБ, аддзел усеагульнай гісторыі новага і навейшага часу)

Апаніруючая арганізацыя Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры

Абарона адбудзецца "27" чэрвеня 2002 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482; тэл. 220 86 33

З дысертацыяй можна азнаеміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Аўтарэферат разасланы "28" мая 2002 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый І.І.Багдановіч

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

*Актуальнасць тэмы даследавання.* Вывучэнне гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносін і такога іх аспекта, як передача Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі, перасяленне польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу і беларускага з Польшчы ў БССР, якое ажыццяўлялася ў 1944-1946 гг., да апошняга часу не з'яўлялася прадметам спецыяльнага даследавання. Вывучэнню гэтай праблемы не спрыяла засакрэчанасць архіўных матэрыялаў, а таксама асвятленне беларуска-польскіх адносін выключна ў рэчышчы савецка-польскіх. Цікавасць да яе разгляду значна ўзрасла пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі і ўсталявання адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча на новых асновах - як раўнапраўных дзяржаў.

Абмеркаванне гэтай праблемы на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, з'яўленне шэрагу артыкулаў, у якіх аўтары зрабілі спробу аб'ектыўнага аналізу асобных аспектаў гэтага працэсу, наяўнасць розных падыходаў беларускіх і польскіх гісторыкаў пры яе асвятленні сведчыць аб яе важнасці і актуальнасці.

Аналіз і абагульненне вопыту міжнароднай дзейнасці БССР, звязанага з падпісаннем і ажыццяўленем пагаднення аб перасяленні насельніцтва, маюць важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Яны будуць спрыяць далейшаму паглыбленню і развіццю раўнапраўных, добрасуседскіх адносін з Польшчай.

*Храналагічныя рамкі даследавання.* Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць 1944-1946 гг. Перасяленне ажыццяўлялася ў час Другой сусветнай вайны і завяршылася пасля яе заканчэння, што значна паўплывала на яго ход.

*Сувязь працы з навуковымі праграмамі, тэмамі.* Тэма дысертацыі была зацверджана Вучоным Саветам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. Работа выконвалася як ініцыятыўная.

*Мэты і задачы даследавання.* Мэта дысертацыі - на аснове глыбокага аналізу крыніц раскрыць прычыны, ход, вынікі абмену насельніцтвам. Гэтая мэта вызначыла наступныя задачы даследавання: паказаць знешнія і ўнутрыпалітычныя фактары, якія абумовілі неабходнасць перадачы Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі і правядзення абмену насельніцтвам; вызначыць сукупнасць фактараў, якія вымушалі насельніцтва да перасялення; вызначыць асноўныя этапы, дынаміку перасяленчага працэса; прааналізаваць колькасны, прафесійны, сацыяльны, стан перасяленцаў; ахарактарызаваць адносіны кіраўніцтва Беларусі да працэса перасялення.

*Аб'ект і прадмет даследавання.* Аб'ектам даследавання з'яўляецца гісторыя заходняга рэгіёна Беларусі ў другой палове 40-х гадоў з моманту падпісання двухбаковага беларуска-польскага пагаднення аб перасяленні насельніцтва 9 верасня 1944 г. і да яго заканчэння ў чэрвені 1946 гг. Прадметам - абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

*Метадалогія і метады даследавання.* Метадалагічную аснову дысертацыйнай працы склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. Пры вывучэнні тэмы выкарыстоўваліся наступныя метады гістарычнага даследавання: гісторыка-сістэмны (устанаўленне функцыянальных сувязей гістарычных падзей і з'яў, раскрыццё ўнутраных механізмаў іх дзеяння), гісторыка-параўнальны (параўнанне гістырычных падзей і з'яў у прасторы і часе, выяўленне падабенства і адрознення паміж імі), гісторыка-генетычны (вывучэнне гістарычных падзей і з'яў у працэсе іх развіцця), гісторыка-тыпалагічны (выяўленне агульных рыс у гістарычных падзеях і з'явах і вылучэнне аднародных стадый у іх развіцці). Гэтыя і іншыя метады выкарыстаны ў даследаванні з улікам яго спецыфікі.

*Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.* Навуковая навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што ўпершыню прадпрынята спроба вывучэння і аналізу працэсу абмена насельніцтвам паміж БССР і Польшчай. Праведзены аналіз колькаснага, прафесійнага, сацыяльнага стану перасяленцаў; вызначаны сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, міжнародныя, канфесійныя і іншыя фактары, якія вымушалі насельніцтва перасяляцца ў абодвух накірунках; паказаны дынаміка і вызначаны асноўныя этапы працэсу перасялення; разгледжана структура, дзейнасць упаўнаважаных Польшчы і прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню, іх узаемаадносіны з мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі; паказана палітыка кіраўніцтва рэспублікі да працэсу перасялення; паказаны ўплыў польскага падполля на перасяленне; разгледжана дыпламатычная дзейнасць урада Беларусі ў час перасялення.

*Практычная значнасць атрыманых вынікаў.* Дысертацыйная праца ў значнай ступені запаўняе прабел у беларускай гістарыяграфіі па адзначанай праблеме. Яе вынікі і матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, гісторыі міжнародных адносін, падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных даведнікаў, распрацоўцы лекцый і спецкурсаў. Вынікі працы выкарыстоўваюцца аўтарам пры правядзенні вучэбна-педагагічнай і навуковай работы, пры правядзенні лекцый, семінарскіх заняткаў, напісанні навуковых і навукова-публіцыстычных артыкулаў.

*Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.*

- Перадача Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі, рашэнне кіраўнікоў краін-удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі аб перасяленні насельніцтва, якое ў выніку ўсталявання новай савецка-польскай дзяржаўнай мяжы не пажадае жыць на тэрыторыях, што адыходзяць як да СССР, так і да Польшчы абумовіла неабходнасць правядзення абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай.
- Перасяленне з'явілася адной з самых масавых хваль беззваротнай міграцыі насельніцтва з Беларусі. Колькасць насельніцтва, якое перасялілася ў

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Польшчу значна перавышала колькасць насельніцтва, якое перасялілася ў БССР, што не магло колькасна і якасна кампенсаваць людскія страты Беларусі пад час перасялення.

- Абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай з'явіўся значным сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным, дыпламатычным фактарам беларуска-польскіх адносін сярэдзіны 40-х гадоў;
- Беларуска-польскае пагадненне ад 9 верасня 1944 г. і дадатковы пратакол да яго ад 25 лістапада 1945 гг. аб абмене насельніцтвам паказалі фармальны характар знешнепалітычнай дзейнасці БССР, яе залежнасць і падпарадкаванасць знешнепалітычнай дактрыне Цэнтра.

*Асабісты ўклад суіскальніка.* Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Аўтарам праведзена праца па выяўленню, збору дакументаў і матэрыялаў, значная частка якіх упершыню ўведзена ў навуковы зварот, іх аналізу, сістэматызацыі і абагульненню.

*Апрабацыя вынікаў дысертацыі.* Дысертацыя абмеркавана і рэкамендавана да абароны на пасяджэнні кафедры ўсеагульнай гісторыі БДПУ імя М.Танка. Вынікі дысертацыйнай працы паведамляліся на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях: "Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнем рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (5-6 снежня 1997 г., г. Гродна); "Granice i pogranicze" (17-21 pazdziemika 1998 г. Bialystok (Польшча); "Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Гісторыя і сучаснасць" (17-18 верасня 1999 г., г. Мінск); "Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы" (16-17 сакавіка 2001 г., Мінск).

*Апублікаванасць вынікаў даследавання.* Па тэме дысертацыі апублікаваны 7 работ, у тым ліку: 3 артыкулы ў матэрыялах навуковых канферэнцый, 2 - у зборніках навуковых прац, 1 - у інфармацыйна-аналітычным бюлетэні, 1 - у раздзеле хроніка-дакументальнай кнігі "Памяць" Пастаўскага раёна. Агульны аб'ём публікацый складае 42 старонкі.

*Структура і аб'ём дысертацыі.* Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, спісу крыніц і літаратуры 147 найменняў, спісу скарачэнняў, дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі 113 старонак. Спіс літаратуры і скарачэнняў - 7 старонак

## Асноўны змест даследавання.

*Ва "Уводзінах"* адлюстроўваецца сучасны стан даследаванасці праблемы, вызначаецца накірунак дысертацыйнага даследавання, даецца абгрунтаванне актуальнасці тэмы, указана праграма, па якой праводзілася даследаванне, вызначаны мэты і задачы, храналагічныя рамкі аб'екта і прадмета вывучэння, названы выкарыстаныя навуковыя метады, паказана навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў, вылучаны асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону, адзначана ступень асабістага ўкладу аўтара ў навуковую распрацоўку тэмы.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



Спіс апублікаваных аўтарам работ па тэме дысертацыі


1. Вялікі А.Ф. Нацыянальна-дэмаграфічная сітуацыя ў заходнім рэгіёне Беларусі. 1944-1947 гг. // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна. - 5-6 снежня 1997 г. / Гродзен. дзярж. ун-т. - С. 269-271.
2. Вялікі А.Ф., Языковіч Л.Е. Перасяленне беларускага насельніцтва з Польшчы ў БССР і з БССР у Польшчу // Кантакты і дыялогі:. - 1998. - № 10-11. - С. 5-7; № 12. - С. 23-30.
3. Вялікі А.Ф. Нацыянальна-дэмаграфічная сітуацыя ў заходнім рэгіёне Беларусі. 1944-1950 гг. // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі Зб. навук. арт. / Бел. дзярж. пед. ун-т, Навук. рэд. У.Ф.Ладысеў. - Мінск, 1988. - С. 112-122.
4. Вялікі А.Ф. Перасяленне беларускага насельніцтва з Брэсцкай вобласці ў адпаведнасці з Пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. // Берасцейскі хранограф. Зб.навук. прац / Брэст. дзярж. ун-т. - Брэст.: Выд-ва С.Лаўрова, 1999. - вып. 2. - С. 135-142.
5. Вялікі А.Ф. Перасяленне беларускага і польскага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў БССР і з БССР ў Польшчу ў адпаведнасці з Пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. // Granice i pogranicza. - Bialystok, 1999. - T.1. - S. 148-153.
6. Вялікі А.Ф. Змяненні ў нацыянальна–дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання Пагаднення ад 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай мяжы. // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск 17-18 верасня 1999 г. / Бел. дзярж. ун-т. - Мінск, 2000. - С. 259-267.
7. Вялікі А.Ф. Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Памяць: Пастаўскі раён: гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Укладальнік К.І.Козак, А.І.Кузняцоў. - Мінск: БЕЛТА, 2001.- С. 457-458.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Рэзюме.
Вялікі Анатоль Фёдаравіч.
Ажыццяўленне абмена насельніцтвам паміж БССР і Польшчый.
1944-1946 гг.

Ключавыя словы: перасяленне, абмен насельніцтвам, пагадненне, міжнародныя адносіны, упаўнаважаныя Польшчы, прадстаўнікі СНК БССР, мяжа, дэмаркацыя, рэгіён, польскае нацыяналістычнае падполле, рэгістрацыя, нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы, прадстаўніцтва, эвакуацыя.

Аб'ект даследавання - гісторыя заходняга рэгіёна Беларусі другой паловы 40-х гадоў, прадмет - абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай у 1944-1946 гг.

Мэта даследавання - на аснове глыбокага аналізу крыніц раскрыць прычыны, характар, ход, вынікі абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай.

Тэарэтычнай асновай дысертацыі з'яўляюцца навуковыя прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызму і метады гістарычнага даследавання: гісторыка-генетычнага аналізу, гісторыка-тыпалагічнага, гісторыка-сістэмнага, гісторыка-параўнаўчага.

Навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што яна з'яўляецца спробай комплекснага даследавання працэсу абмена насельніцтвам у 1944-1946 гг, своеасаблівасцям яго правядзення ў заходнім рэгіёне Беларусі.

У выніку праведзеннага даследавання паказаны ўнутры і знешнепалітычныя фактары, якія абумовілі неабходнасць перадачы Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі і правядзення абмену насельніцтвам, вызначаны грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, канфесійныя, міжнародныя, роднасныя фактары, якія ўплывалі на прыняцце насельніцтвам рашэння аб перасяленні, ахарактарызавана праца ўпаўнаважаных Польшчы і прадстаўнікоў СНК БССР па ўліку, рэгістрацыі і перавозцы насельніцтва, прааналізаваны колькасны, сацыяльны, прафесійны склад перасяленцаў, вызначаны асноўныя этапы перасяленчага працэса, разгляджаны адносіны кіраўніцтва Беларусі да гэтага працэсу.

Вынікі даследавання, назапашаны матэрыял можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый, спецкурсаў па гісторыі Беларусі і Польшчы, гісторыі міжнародных адносін, выданні энцыклапедычных і краязнаўчых даведнікаў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



Резюме.

Великий Анатолий Фёдорович.
Осуществление обмена населением между БССР и Польшей.
1944-1946 гг.

Ключевыя слова: переселение, обмен населением, соглашение, уполномоченные Польши, представители СНК БССР, граница, демаркация, регион, польское националистическое подполье, регистрация, международные отношения, национально-государственные интересы, представительство, эвакуация.

Объектом исследования является история западного региона Беларуси второй половины 40-х годов, предмет - обмен населением между БССР и Польшей.

Цель исследования - на основе анализа источников раскрыть причины, характер, ход, итоги обмена населением.

Теоретической основой диссертации являются научные принципы объективности и историзма и методы исторического исследования: историко-генетического анализа, историко-типологического, историко-системного, историко-сравнительного.

Новизна диссертации заключается в том, что она является попыткой комплексного исследования процесса обмена населением в 1944-1946 гг., особенностей его проведения в западном регионе Беларуси.

В диссертации показаны внутри и внешнеполитические факторы, которые обусловили необходимость передачи Польше части территории БССР, а так же проведения обмена населением, определены общественно-политические, социально-экономические, конфессиональные, международные и другие факторы, влиявшие на принятие решения о переселении, охарактеризована деятельность уполномоченных Польши и представителей СНК БССР по учету, регистрации и перевозке населения, проанализирован количественный, социальный, профессиональный состав переселенцев, показано отношение руководства Беларуси к процессу переселения.

Результаты исследования могут быть использованы при подготовке лекций, спецкурсов по истории Беларуси и Польши, истории международных отношений, издании энциклопедических и краеведческих пособий.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Summary.
Veliky Anatoly Fedorovich
Exchange of population between of BSSR and Poland
in 1944-1946.

The key words: resettlement, agreements, board, representatives of Poland, representatives of Belarus, region, Polish national anti-Soviet movement, international relations, evacuation, national-state interests, negotiations.

The object of the given research is the history of Western region of Belarus during the second half of 40-th , the subject - resettlement of Poles from Western region of Belarus to Poland and Belarussians from Poland to Belarus.

The main aim of the research is to show that resettlement of the Poles from Belarus to Poland and Belarussians from Poland to Belarus promote resolving one of the most complicated ethnic problem Belarussians-Polish relation in Post-War time.

The theoretical base of the thesis is formed by scientific principles and method of historical research: objectivity, historical approach, historical-genetic, historical-comparative analysis.

The novelty of the thesis is that first attempt of complex research processes of resettlement of populations in 1944-1946 and peculiarity of it fulfillment in Western region of Belarus.

The thesis reflects social-economic, social-politic, religious, international and others factors which influenced at the decision of citizen to resettle, analysis of the activity of representatives of Poland and Belarus at registration and resettle of population, quantity, social, professional, age structure of resettles, attitude of the high and local authorities to the processes of resettlement.

The gathered materials can be used for lectures and preparing special course of the history of Belarus, for further elaboration of the problems of the history of Western Belarus, history international relations, history of Poland.

